# Займеннік. Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага

***Мэты:***

- узгадаць і абагульніць веды пра займеннік як самастойную часціну мовы, асаблівасці яго ўжывання ў беларускай мове;
- удасканальваць уменні выдзяляць займеннік сярод іншых часцін мовы, характарызаваць яго віды, марфалагічныя асаблівасці, вызначаць сінтаксічную ролю ў сказе, ужываць ва ўласным маўленні;
- выхоўваць пачуццё любові да Радзімы, да роднага куточка, дзе нарадзіліся.

***Тып урока:*** урок-падарожжа

***І.Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой на працу***

Вось ізноў звінеў званок,
Запрасіў нас на ўрок.
Добры дзень, я вас вітаю,
Да заняткаў запрашаю.
Наш урок хай будзе плённым,
І цікавым, і натхнёным.
Поспехаў я вам жадаю,
Калі што – я паспрыяю.

**Настаўнік:** Паглядзіце ў акно. Зараз на вуліцы вясна. І мне захацелася, каб вясна была не толькі на вуліцы, але і ў нашым класе. Вы, напэўна, ведаеце, што першай прыкметай вясны з'яўляецца цёплае сонечнае надвор'е, калі пачынае таяць снег, пад нагамі бягуць ручайкі. *"Зіма плача",* - кажуць у народзе. А яшчэ адной з прымет надыходу вясны з'яўляюцца кветкі. Успомніце, якія першыя кветкі з'яўляюцца вясной?

**Вучань:** Пралескі.

**Настаўнік:** Правільна. Той, хто сёння вельмі добра будзе працаваць на ўроку, атрымае ад мяне пралеску. У каго будзе найбольш кветачак, той атрымае 10 балаў.

**Настаўнік:** А зараз, я папрашу вас звярнуць увагу на дошку.

***Маю некалькі ў мове нагрузак патрэбных:***
***Замяняю назоўнік, прыметнік, лічэбнік?***

**Настаўнік:** Падумайце і адкажыце, пра якую часціну мовы ідзе гаворка ў наступнай загадцы.
**Вучань:** Пра займеннік.

***ІІ. Паведамленне тэмы, пастаноўка мэт і задач урока***

**Настаўнік:** На ўроках мы з вамі пазнаёміліся з такімі іменнымі часцінамі мовы як назоўнік, прыметнік, лічэбнік. А сёння мы ўзгадаем і абагулім веды пра часціну мовы, што можа замяняць усе раней згаданыя, хоць яна прадстаўлена адносна невялікай колькасцю слоў.

**Настаўнік:** Мы з вамі будзем удасканальваць набытыя вамі ўменні выдзяляць займеннік сярод іншых часцін мовы, характарызаваць яго разрады, марфалагічныя асаблівасці, вызначаць сінтаксічную функцыю ў сказе і далей працягваць ужываць займеннікі ва ўласным маўленні.

І, канечне, на гэтым уроку мы з вамі будзем гаварыць пра нашу Радзіму, пра тое, як моцна мы яе любім. Усе мы павінны зрабіць так, каб наш родны край стаў яшчэ прыгажэйшы.

А зараз мы адпраўляемся ў падарожжа ў горад Займеннік.

Каб патрапіць нам у гэты горад, трэба расшыфраваць пароль. Такім паролем будзе эпіграф нашага сённяшняга ўрока.

***Мая зямля завецца Беларуссю.***

***Яна, як спадчына, мне ад дзядоў,***

***Дзе б ні была, а сэрцам я гарнуся***

***Да ніў яе, да волатаў-дубоў.***

**Настаўнік:** Як вы разумееце гэтыя радочкі?

***<u>Заданне :</u>*** Паспрабуйце запісаць гэтыя радочкі па памяці, знайдзіце ў тэксце займеннікі і вызначце іх разрад.

***III. Паўтарэнне і абагульненне***

**1. *<u>Франтальнае апытванне</u>***

**Настаўнік:** І так мы паспяхова прайшлі праз вароты нашага казачнага горада Займеннік і зараз накіроўваемся ў аўтобус, каб наведаць самыя знакамітыя мясціны. Але вы ведаеце, што ў аўтобусе заўсёды трэба набываць білет, які па дарозе можа праверыць кантралёр. Такім кантралёрам на нашым шляху выступяць тэарэтычныя пытанні, адказаўшы на якія, мы будзем рухацца далей. Памятайце, што мы адказваем прыгожа, па-беларуску, на пытанні даём поўныя адказы, падмацоўваючы іх прыкладамі.

1. *Што такое займеннік?*
2. *На якія разрады паводле значэння падзяляюцца займеннікі?*
3. *Якія займеннікі выкарыстоўваюцца ў мове замест назоўнікаў?*
4. *Які займеннік не мае формы назоўнага склону?*
5. *Што абазначаюць прыналежныя займеннікі? З якімі прыметнікамі яны суадносяцца?*
6. *Чаму лёгка зблытаць адносныя і пытальныя займеннікі?*
7. *На што паказваюць указальныя, азначальныя, адмоўныя і няпэўныя займеннікі?*
8. *Якая роля займеннікаў у мове?*

**Настаўнік:** Ну а зараз мы з вамі рухаемся далей.

**Настаўнік:** Першы наш прыпынак **“Асабовыя і прыналежныя займеннікі”.**

***<u>Заданне 2:</u>*** Замяніце самастойныя часціны мовы на займеннікі (вусна)

1. Міця вярнуўся дахаты вясёлы. Міця ахвотна паказаў дзённік бацькам.
2. На 8 Сакавіка дзяўчынкам уручылі падарункі. Падарункі вельмі парадавалі дзяўчынак.
3. Шпакі зляцеліся ў чароды, няма шпакоў сёння на дварах.
4. У школу ішла суседская дзяўчынка Света. Света вучыцца ў шостым класе.

**Настаўнік:** Якімі займеннікамі мы з вамі замянілі назоўнікі?

**Вучань:** Асабовымі.

**3.** ***<u>Заданне:</u>*** Выразна прачытайце тэкст, вызначце яго асноўную думку. Выпішыце з тэксту прыналежныя займеннікі. Вызначце іх род, лік і склон. (Першы займеннік разбірае вучань каля дошкі разам з класам, потым усе выконваюць самастойна).

***Мая*** *(Н., адз., ж.) Беларусь...*

*<u>Галоўны **твой** (Н., адз., м.) скарб — людзі!</u> Беларусы здаўна жывуць мудрымі запаветамі прашчураў: Сонца — на ўсіх адно, Зямля — адна, трымайся **сваёй** (Р., адз., ж.) хаты, беражы **свой** (В., адз., м.) гонар, не бяры чужое. Ніколі і нікому не ўдавалася зняволіць **наш** (В., адз., м.) вольналюбівы народ, які ўслаўляе **сваю** (В., адз., ж.) зямлю, гаворыць усяму свету пра добрае **сваё** (В., адз., н.) імя, імя яго радзімы.*

***<u>Праверка задання:</u>*** зверыць з запісам на дошцы.

**Настаўнік:** Прачытайце, калі ласка, умову задання, змешчанага на картках, якія вы атрымалі.

***<u>4.Заданне:</u>*** Замест кропак пастаўце займеннік ***сябе*** ў патрэбнай форме. Вызначце яго склон.

*З гадамі я навучыўся больш цаніць самога ... . Трэба заўсёды старацца трымаць ... ў руках. Не магу дараваць ... такога неабдуманага ўчынку. Трэба непакоіцца не толькі пра ... , але і пра іншых. Лепш адмовіць ... ў чым-небудзь, чым свайму сябру.*

***<u>Праверка задання:</u>*** на слайдзе (самаправерка).

**Фізхвілінка.**

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Я не маю часу спаць:
Ведаю спачатку-зраблю я зарадку.
Першае заданне – гэта прысяданне…
То сагнуся я ў дугу, то на месцы пабягу.
А пасля прыгожа
Засцілаю ложак.
Чышчу зубы, мыю вушы,
Пяць хвілін стаю пад душам.
Дожджык чвошча па спіне,

Дожджык слухае мяне.

**Настаўнік:** Успомніце, якія займеннікі адносяцца да **азначальных**?

**Вучань:** Да азначальных займеннікаў адносяцца **сам, самы, кожны, увесь, усё, іншы**.

**Настаўнік:** Што абазначаюць **указальныя** займеннікі? Пералічыце, калі ласка, указальныя займеннікі.

**Вучань:** Указальныя займеннікі ўказваюць на прадмет. Да іх адносяцца **той, такі, гэты, гэтакі, гэтулькі**.

***5 Заданне:*** Выпісаць са сказаў указальныя і азначальныя займеннікі. Вызначыць іх род, лік, склон.

1. Сёння гэткі дзівосны дзень!
2. Усё жывое на зямлі патрабуе пяшчоты і ласкі.
3. Той дзень прапаў і страчаны навекі, калі ты не зрабіў таго, што мог.
4. Шануем мы светлую, добрую долю, за гэтую долю грудзьмі пастаім.

***Праверка задання:*** вучні вусна зачытваюць выпісаныя займеннікі.

1. Сёння **гэткі (Н., м., адз.)** дзівосны дзень!
2. **Усё (Н., н., адз.)** жывое на зямлі патрабуе пяшчоты і ласкі.
3. **Той (Н., н., адз.)** дзень прапаў і страчаны навекі, калі ты не зрабіў **таго (Р., н., адз.),** што мог.
4. Шануем мы светлую, добрую долю, за **гэтую (В., ж., адз.)** долю грудзьмі пастаім.

**Настаўнік:** Наступны наш прыпынак ***“Пытальныя і адмоўныя займеннікі”.***

**6. *Заданне на картках:*** Выразна прачытайце тэкст. Выпішыце з тэксту адзін сказ з пытальным займеннікам і адзін з адносным.

*Якая, вы думаеце, самая цікавая кніга на свеце? Адразу не адкажаце, не здагадаецеся. Гэта кніга – зямля, на якой мы жывём і якая з першых год нашага жыцця штодня вучыць нас гісторыі, мове. Яна адкрывае нам усё новыя і новыя словы, значэнне і сэнс якіх мы вучымся спазнаваць і разумець.*

*Тысячы і мільёны назваў існуе на зямлі. Кожная яе мясціна мае сваю назву.*

*Добра было б, каб адзін са сваіх сшыткаў вы назвалі “Мая бацькаўшчына” або “Мой родны кут”. У ім запісалі ўсё самае цікавае, пра што дазнаецеся ад старэйшых людзей.*

***Праверка задання:*** вучні вусна зачытваюць выпісаныя сказы.

**Настаўнік:** Наступны наш прыпынак **“Няпэўныя і адмоўныя займеннікі”**

***7.Заданне:* *Запішыце сказы, раскрыўшы дужкі, уставіўшы прапушчаныя літары.***

- (Ні)якае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мовую.
- Ціха адчыніліся дзверы, і хтос(?)ці ўвайшоў.
- Раскажы, тата, што(небудзь) цікавае.
- (Не)хта спяшаецца, камус(?)ці не спіцца, (не)кага гоніць радасць адкрыцця.
- Гэта не (абы)што, а падарунак маме.

***IV. Дамашняе заданне***

Творчае заданне: напісаць сачыненне на адну з тэм: «Кветкі маёй роднай зямлі», «Мая малая Радзіма»

***V. Абагульненне (абагуліць разам з вучнямі), рэфлексія***

1. Сказаць, што атрымалася, а што не, каму звярнуцца да кантрольных пытанняў і заданняў на с. 354 - 355.

2. Вучні выказваюцца пра сваю работу на ўроку (што выклікала цяжкасці, што было цікавае, запамінальнае), даюць ацэнку сваёй рабоце.

***VI. Падвядзенне вынікаў урока***

Пракаменціраваць усе адзнакі, даць парады тым, у каго не ўсё атрымалася.